модель увеличивает эффективность предоставления и передачи знаний, что, безусловно, активизирует процесс коммуникации. В этой связи чрезвычайно важным становится фактор повышения ответственности журналиста не только за достоверность фактов и систему оценок, но и за коммуникативную компетентность, культуру коммуникации как основу его профессионализма.

Развитие языка СМИ во многом определяется технологическим прогрессом в информационно-коммуникационной сфере. В создании и распространении сообщений средств массовой информации обязательно принимают участие новейшие технические средства и устройства, поэтому динамичное развитие технологий не может не оказывать влияние на всю цепочку производства, распространения информации, конструирования текста и даже стирания границ между медиа.


*Литература*

1. Засурский, Я.Н. Медиатекст в контексте конвергенции / Я.Н. Засурский // Язык современной публицистики: сб. ст. / сост. Г.Я. Солганик. – М.: Флинта: Наука, 2005. – 232 с.
2. Культура русской речи. Энциклопедический словарь-справочник. – М., 2003. – С. 791–793.



**Лада Алейнік**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*


# ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ЮНАЦТВА
## (на матэрыяле літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя»)

Літаратурна-мастацкім часопісам належыць асаблівае месца сярод іншых перыядычных выданняў. Несумненна, сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і найноўшыя сродкі камунікацыі склалі беспрэцэдэнтную канкурэнцыю друкаваным выданням, чытацкая аўдыторыя «тоўстых» часопісаў сёння істотна звузілася. Калі ў другой палове ХХ ст. менавіта літаратурна-мастацкія часопісы выконвалі функцыю грамадскіх трыбунаў, з’яўляліся інтэлектуальнымі цэнтрамі і навігатарамі культурнага жыцця, то ў пачатку ХХІ ст. гэтыя выданні прыцягваюць увагу пераважна прафесіяналаў-гуманітарыяў – крытыкаў, літаратуразнаўцаў, настаўнікаў агульнаадукацыйных школ і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў. Калегіі часопісаў, натуральна, распрацоўваюць новыя рэдакцыйныя стратэгіі, якія арыентуюцца перадусім на запатрабаванні чытацкай аўдыторыі.

Часопіс «Полымя» заўжды з’яўляўся трыбунай старэйшых пісьменнікаў. На старонках выдання друкаваліся пераважна вопытныя мастакі слова, а таксама аўтарытэтныя вучоныя-літаратуразнаўцы, публікацыі якіх вылучаліся

акадэмізмам і былі разлічаны найперш на выкладчыкаў вышэйшай школы і студэнтаў гуманітарнага профілю. Аднак у пачатку XXI ст. часопіс усё часцей змяшчае матэрыялы, адрасаваныя школьнікам, школьным настаўнікам і нават педагогам дашкольных устаноў.

Так, напрыклад, у 2005 г. на старонках выдання была адкрыта рубрыка «Школьны факультатыў». Вядома, што факультатыў – форма заняткаў, накіраваная на пашырэнне, паглыбленне і карэкцыю ведаў вучняў з улікам іх індывідуальных запатрабаванняў і здольнасцей, а таксама на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці школьнікаў. Менавіта гэтымі прынцыпамі кіравалася рэдакцыйная калегія часопіса. Галоўны рэдактар у прадмове да першай публікацыі падкрэсліў: «З мэтай паспрыяць выкладчыкам роднай літаратуры ў пошуку патрэбнага матэрыялу, мы раскажам пра творцаў і творы, якія, на думку рэдакцыі, варты такой увагі. Апошнім часам недастаткова паглыблена вядзецца праца ў гэтым кірунку айчыннай крытыкай. Нячаста змяшчаюцца рэцэнзіі на новыя кнігі ў перыядычных выданнях, амаль зусім не гаворыць пра літаратурны працэс беларускае тэлебачанне. А ў літаратуры стала працуе некалькі пакаленняў паэтаў, празаікаў, драматургаў… На нашу думку, сярод іх ёсць і тыя, чые творчыя набыткі могуць пачэсна ўвайсці ў школьную праграму, абнавіць яе і пазбавіць ад пэўнай архаікі, яскрава паказаць, што літаратурны працэс не стаіць на месцы і што яго развіццё вынікова плённае» [2, с. 164].

Матэрыялы, якія змяшчала рубрыка «Школьны факультатыў», былі прысвечаны творчасці С. Грахоўскага, А. Разанава, Л. Дайнекі, А. Асіпенкі, А. Пысіна, Р. Баравіковай, А. Вярцінскага, Л. Дранько-Майсюка, Я. Янішчыц, А. Пісьмянкова і шматлікіх іншых пісьменнікаў. Гэтыя матэрыялы насамрэч істотна дапамагалі настаўнікам у падрыхтоўцы ўрокаў, факультатыўных заняткаў і творчых мерапрыемстваў, відавочна садзейнічалі інтэнсіфікацыі філалагічнага навучання, пра што сведчылі лісты ў рэдакцыю не толькі саміх школьных настаўнікаў і метадыстаў, але нават вучняў.

Менавіта водзывы чытачоў паспрыялі заснаванню ў «Полымі» яшчэ адной рубрыкі, адрасаванай сярэдняй школе. У 2008 г. у часопісе пачала друкавацца рубрыка «Школьныя даляглядзы», якая, у адрозненне ад папярэдняй, была арыентавана не на персаналіі, а на ўсебаковае асвятленне жанравай спецыфікі літаратуры. Кожны выпуск рубрыкі змяшчаў публікацыі тэарэтычнага і аглядавага характару, рэцэнзіі, а таксама арыгінальныя мастацкія творы, якія друкаваліся ў часопісе ўпершыню. Так, напрыклад, рубрыка «Школьныя даляглядзы» ў № 5 за 2008 г. была прысвечана жанру аповесці. У выпуск увайшоў тэарэтычны артыкул «Жанр аповесці ў беларускай літаратуры» І. Ківель, рэцэнзія М. Шамякінай «Падарожжы ў часе і экскурсы ў гісторыю» на аповесць Р. Баравіковай «Казімір – сын Ягайлы + Насця з 8 «Б» = каханне», рэцэнзія Л. Алейнік «Нельга двойчы ўвайсці ў адну раку»

на аповесць А. Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» і аповесць В. Гапеева «Лёшкава каханне, альбо Віртуальнае дрэва рэальнасці». Як бачна, жанр аповесці набываў такім чынам дастаткова грунтоўнае і шматбаковае асвятленне.

Настаўнікі літаратуры неаднаразова выказвалі ўдзячнасць рэдакцыйнай калегіі «Полымя» за прафесійную дапамогу ў іх працы, звярталіся ў рэдакцыю з канкрэтнымі просьбамі і прапановамі. Своеасаблівым сведчаннем увагі педагогаў да «школьных рубрык» часопіса з'явілася дыскусія «Паміж пісьменнікам і чытачом», датычная зместу літаратурна-мастацкіх часопісаў, якая адбылася ў 2011 г. на старонках газеты «СБ». У дыскусіі ўзялі ўдзел У. Ліпскі, А. Мальдзіс, іншыя дзеячы беларускай культуры і навукі. Так, настаўнік-метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі гімназіі № 4 г. Брэста Н.С. Дрык выступіла на старонках газеты з рэзкай крытыкай часопісаў за размяшчэнне празмерна аб'ёмных узораў прозы, якія друкуюцца часткамі на працягу амаль года, за друкаванне літаратурных узораў, надзвычай слабых паводле мастацкіх вартасцей. Але разам з тым у артыкуле было адзначана: «Мы, педагогі, адзін час зацікавіліся «Полымем», калі там сталі друкаваць рубрыку «Школьныя далягляды». Яе матэрыялы можна выкарыстоўваць на ўроках, факультатывах. А для аўтараў малацікавых опусаў патрэбны выданні, дзе яны змогуць друкавацца за ўласныя грошы» [1, с. 7].

Сёння рэдакцыйная калегія часопіса «Полымя» гэтаксама не страчвае ўвагі да вышэйшай і агульнаадукацыйнай школ, дапамагае выкладчыкам вучэбна-метадычнымі і літаратуразнаўчымі матэрыяламі, асвятляе актуальныя праблемы літаратуры для дзяцей і юнацтва. Напрыканцы мінулага года (у № 12 за 2014 г.) на старонках выдання былі надрукаваны матэрыялы дыскусіі «Экстрэмальна небяспечны занятак», прысвечанай абмеркаванню сучаснага стану і далейшых перспектыў беларускай дзіцячай літаратуры. У дыскусіі ўзялі ўдзел прадстаўнікі розных навуковых статусаў, розных узростаў і, натуральна, рознага жыццёвага досведу: прафесары Л. Сінькова і Т. Шамякіна, дацэнты А. Бязлепкіна і Ф. Драбеня, магістрант філалагічнага факультэта БДУ І. Ясюк і студэнты гэтай жа навучальнай установы Н. Карнацкая і І. Купцэвіч, малады пісьменнік Я. Мартыновіч і інш. Фактычна ўсе аўтары падзяліліся перадусім індывідуальнымі гісторыямі – расказалі, якія падзеі ў іх асабістым жыцці адыгралі вызначальную ролю, якім чынам у іх некалі абудзілася любоў да кнігі, да літаратуры, *хто* альбо *што* на іх паўплывала. У кожным матэрыяле ўтрымліваецца надзвычай багатая фактура – імёны і назвы твораў айчынных і замежных пісьменнікаў, якія ўдзельнікі дыскусіі лічаць найбольш вартымі, з якімі раяць пазнаёміцца школьнікам. Адметна, што нават назвы матэрыялаў вельмі «гаваркія», многія з іх з'яўляюцца ключавымі тэзамі аўтарскіх выступленняў: «Перадусім – асабісты прыклад», «Сям'я і школа павінны аб'яднаць намаганні», «Мы

жывём у новай інфармацыйнай прасторы», «Небяспека інтэрнэту моцна перавялічана» і інш.

Публікацыя атрымалася досыць грунтоўная, яна не толькі выявіла праблемы літаратуры, адрасаванай юным чытачам, але ў пэўнай ступені вызначыла шляхі іх пераадолення, напрамкі дзейнасці і пісьменнікаў, і настаўнікаў, і вучоных-філолагаў. Зусім не дзіўна, што публікацыя выклікала розлагас сярод педагогаў – рэдакцыя атрымала шэраг змястоўных лістоў ад настаўнікаў, якія далучыліся да гаворкі, падзяліліся ўласнымі меркаваннямі і практычнымі парадамі. (Друкаванне допісаў чытачоў будзе адбывацца ў часопісе цягам бягучага года ў рубрыцы «З рэдакцыйнай пошты»).

Напрыканцы мэтазгодна падкрэсліць, што стратэгія часопіса «Полымя» з'яўляецца выразным сведчаннем, якую істотную ролю здольны выконваць літаратурна-мастацкія часопісы ў сучасным адукацыйным працэсе, наколькі плённа яны могуць садзейнічаць развіццю літаратурнага досведу вучняў і студэнтаў, па вялікім рахунку – уплываць на школьную праграму, фарміраваць грамадскае меркаванне і ўяўленне аб літаратурных аўтарытэтах.

*Літаратура*

1. Дрык, Н.С. Книги и школа / Н.С. Дрык // С.Б. Беларусь сегодня. – 2011. – 24 нояб. – С. 7.
2. Мятліцкі, М. Школьны факультатыў / М. Мятліцкі // Полымя. – 2005. – № 9. – С. 164.

**Екатерина Афанасьева (Горская)**
*Киевский национальный университет им. Тараса Шевченко (Украина)*

## РЕГУЛИРОВАНИЕ МЕДИАКОНТЕНТА: МЕЖДУНАРОДНЫЕ ВЫЗОВЫ И НАЦИОНАЛЬНЫЕ ПОДХОДЫ

Глобализационные процессы, происходящие в мире, отразились и на сфере массовой информации, прежде всего в явлении конвергенции современных медиа. По утверждению исследователя информационных трансформаций Итиэлья де Сола Пул, «конвергенцию» следует рассматривать как «стирание границ между медиа как средством обоюдной коммуникации (телефон, почта, телеграф) и медиа – средством массовой коммуникации (пресса, радио и телевидение)». Прежде односторонняя коммуникация становится многовекторной в условиях конвергенции. Развитие гражданской журналистики, появление большого количества медиаплатформ, демократизация процесса медиапроизводства – эти и многие другие изменения, произошедшие в модели сбора, генерации и распространения информации, ста-